*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. Sorokovik*
Academy of management under the President of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 340(091)(476)**

# СТАНАЎЛЕННЕ І АРГАНІЗАЦЫЯ ІНСТЫТУТА КРЫМІНАЛІСТЫКІ І СУДОВАЙ ЭКСПЕРТЫЗЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1920–1930-Я ГГ.

# ESTABLISHMENT AND ORGANIZATION OF THE INSTITUTE OF CRIMINALISTICS AND FORENSIC EXAMINATION IN BELARUS IN 1920–1930

*Артыкул прысвечаны асаблівасцям станаўлення і арганізацыі Інстытута крыміналістыкі і судовай экспертызы ў БССР у 1920–1930-я гг. Тэма слаба даследавана гістарычнай навукай.*

*Ключавыя словы: БССР; савецкая ўлада; інстытут; крыміналістыка; судовая экспертыза; вучоны; даследаванне; злачынства.*

*The article is devoted to the peculiarities of the formation and organization of the institute of criminology and forensic examination in the BSSR in 1920–1930. The topic is poorly studied by historical science.*

*Keywords: BSSR; Soviet power; institute; criminalistics; forensic examination; scientist; research; crime.*

Для ўсякага грамадска-палітычнага ладу характэрны злачынствы. Яны не залежаць ад палітычнага рэжыму. Могуць толькі праяўляцца ў большай ці меншай ступені. У сувязі з гэтым грамадства праз дзяржаву арганізавала адпаведныя сродкі для барацьбы са злачыннасцю. Пад уздзеяннем чалавека адбываецца вынаходніцтва і прымяненне прылад працы, ускладненне грамадскага жыцця, яго развіццё, класавае расслаенне. Паралельна з гэтым удасканальваліся сродкі і метады злачынства. І так на кожным этапе гістарычнага развіцця. На першым этапе гістарычнага развіцця чалавецтва для барацьбы са злачынствам было дастаткова прыродных навыкаў чалавека, атрыманых на аснове шматгадовай практыкі расследавання. Гэтым займаліся найбольш прыдатныя для гэтай справы асобы. У Вялікім Княстве Літоўскім іх называлі возмымі (раней – віжамі), што відавочна з арт. 4, 8, 9, 10, 11 і інш. раздз. IV Статута ВКЛ 1588 г. [1, с. 62, 64–67].

Аднак з бурным развіццём капіталізму гэтага стала недастаткова. Эмпірычныя веды практыкаў паступова пачалі абагульняцца, аналізавацца, набываць навуковы характар. Піянерамі ў гэтай справе сталі

нямецкія і аўстрыйскія вучоныя канца XIX ст., цесна звязаныя з веданнем крымінальнага права і дасягненнямі прыродазнаўства. Паступова крыміналістыкай авалодалі і рускія даследчыкі ў пачатку XX ст.

Больш складанымі былі ўмовы на тэрыторыі Беларусі, якая не толькі не мела юрыдычных навучальных устаноў на гэты час, але нават вышэйшых навучальных устаноў. Больш за тое, спецыфічнымі былі адносіны Савецкай улады да злачынстваў. Афіцыйна лічылася, што яны – гэта язвы капіталізму і пры новай уладзе іх не павінна быць з-за высокай свядомасці чалавека сацыялістычнага грамадства. З перамогай сацыялізму ў канцы 1930-х гг. гэты крымінальны інстытут сталі называць перажыткамі капіталізму, а з прыняццем Канстытуцыі СССР 1977 г. – асобнымі пралікамі, недахопамі асобных людзей і асобных кіраўнікоў.

Аднак рэальнае жыццё вымушала ўладу сур’ёзна падыйсці да пытання барацьбы са злачыннасцю. Для паспяховай дзейнасці патрабавалася веданне крыміналістыкі, арганізацыя спецыялізаванай спецыяльнай установы, якая б займалася гэтай справай у дапамогу да міліцыі. Таму высвятленне станаўлення і арганізацыі такой установы мае актуальнае значэнне. Ад яе дзеяння ў многім залежыла дзейнасць практычна ўсіх праваахоўных органаў. Галоўная задача яе заключалася ў тым, каб прадаставіць міліцыі, крымінальнамц вышуку (на пачатку 1920-х гг. ён дзейнічаў самастойна), следчым, пракуратуры, суду крыміналістычныя сродкі, прыёмы, рэкамендацыі, адметныя методыкі расследавання, папярэджання злачынстваў і інш. А каб іх прадаставіць, то неабходны былі спецыялісты, аб’яднаныя ў адну ці ў некалькі спецыяльных устаноў.

У той жа час утварыць адразу усе неабходныя структурныя дзяржаўныя адзінкі маладой савецкай рэспублікі – ССРБ – не яўляўлялася магчымым: не існавала спачатку адпаведных юрыдычных кадраў. Першапачаткова галоўным стала арганізацыя вышэйшых і мясцовых органаў улады, утварэння Чырвонай Арміі і праваахоўных органаў. Толькі з 1921 г. пачало дзейнічаць прававое аддзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яму самому не хапала высокакваліфікаваных юрыдычных кадраў. Дзякуючы першаму рэктару БДУ прафесару У. І. Пічэту, які скончыў Маскоўскі ўніверсітэт і выкладаў у ім некаторы час, удалося запрасіць на працу ў рэспубліку шэраг вядомых яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд навукоўцаў з Масквы, Яраслаўля, Саратава і іншых гарадоў Расіі. Толькі вахтавым метадам для выкладання ў БДУ прыязджала 10 навукоўцаў-юрыстаў, у асноўным з Яраслаўля і Саратава [2, Арк. 154, 97 44]. Многія з іх раней працавалі ў Маскоўскім універсітэце, што сведчыла аб іх высокім навуковым і выкладчыцкім узроўні. Гэта прафесары А. У. Гарбуноў, Л. В. Лубный-Герцык, К. А. Архіпаў, У. М. Дурдзянеўскі, М. М. Краўчанка і інш. [3, Арк. 120].

Сярод прыезжых прафесараў быў і Аляксандр Карлавіч Ленц (1882–1952), які закончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта,

а таксама Ваенна-медыцынскую акадэмію. Ужо ў савецкі час ён стаў доктарам медыцынскіх навук, прафесарам.

Між тым крымінагеннае становішча на тэрыторыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь было вельмі складаным. Яно вынікала з цэлага шэрагу прычын.

Па-першае, быў устаноўлены новы грамадскі і дзяржаўны лад, для якога галоўнай задачай на першым часе была барацьба са знешнімі і ўнутранымі ворагамі Савецкай улады дзеля яе ўмацавання.

Па-другое, Савецкая Беларусь фактычна з другой паловы 1919 г. да 1924 г. складалася толькі з шасці паветаў былой Мінскай губерніі і не была ўстаноўлена трывалая пагранічная мяжа з суседнімі капіталістычнымі дзяржавамі. Адсюль развітасць кантрабанды на тэрыторыі рэспублікі.

Па-трэцяе, у гады Першай сусветнай, а затым польска-савецкай, Грамадзянскай войнаў Беларусь апынулася ў іх эпіцэнтры. Войны нанеслі непапраўімы ўрон. Толькі за гады Першай сусветнай вайны, па дадзеных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, загінула не менш 600 тыс. чалавек, разбурана была народная гаспадарка. Гэта выклікала рост цэн на тавары як паўсядзённага попыту, так і доўгатэрміновага. Зарплата працоўных не паспявала за ростам цэн, асабліва на прадукты харчавання, паліва, жыльё. Спекуляцыя, конекрадства, грабяжы, разбоі, буйныя і дробныя злачынствы сталі звычайнай з’явай першых гадоў Савецкай улады. Колькасць узбуджаных па лініі крымінальнага вышуку спраў у 1924 г. склала 30 154, у 1925 г. – 67 212, у 1927 г. – 84 250. Маюцца і другія паказчыкі: калі у 1924 г. на 10 тыс. насельніцтва па Беларускай ССР было ўзбуджана 75,8 % крымінальных спраў, то ў 1925 г. – 164,3 %, а ў 1927 г. – 171,3 % [4, с. 101]. Як бачна, рост за гэты час вырас амаль у 2,8 разы. А латэнтная злачыннасць, як вядома праваахоўным органам, была намнога большай афіцыйных дадзеных аб злачыннасці.

Такое крымінагеннае становішча патрабавала экстранных мер з боку дзяржавы. Яна іх і прымала па меры сваіх магчымасцей. Новыя праваахоўныя органы толькі складваліся. Іх кадрам не хапала не толькі спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў, але нават агульнай адукацыі. Ды і колькасна іх было мала. У такіх умовах і не магло быць размовы пра ўтварэнне спецыялізаванай установы, якая б займалася пытаннямі крыміналістыкі і судовай экспертызы, хоць гэта пытанне ставілася ў асяродку практыкаў і вучоных.

Па сведчанні аўтараў «Очерков по истории юридических научных учреждений в СССР», прававыя праблемы ў Беларусі даследавалі не толькі вучэбныя і акадэмічныя ўстановы, але і Інстытут крыміналістыкі і судовай экспертызы, які быў створаны ў 1926 г. [5, с. 54]. Аднак звестак аб адкрыцці такога інстытута ў 1926 г. намі не выяўлена, хоць размовы аб неабходнасці гэтага для рэспублікі мелі месца.

Як паказвае даследаванне, шлях да гэтай установы быў не такі просты. Выкладчык і даследчык Ф. І. Гаўзе (1897–1990) у матэрыяле «Аб арганізацыі навукова-судовай экспертызы ў БССР», надрукаваным у пачатку 1928 г., ставіў пытанне пра адкрыццё навукова-даследчага інстытуту экспертызы. Сваю прапанову аргументаваў патрэбнасцямі следства, а таксама тым, што Украіна мае інстытуты навукова-судовай экспертызы ў Кіеве, Харкаве і Адэсе [6, с. 11, 12]. З гэтага вынікае, што Інстытута крыміналістыкі і судовай экспертызы ў 1926 г. яшчэ не было.

Магчыма, аўтары «Очерков» мелі на ўвазе тое, што 30 кастрычніка 1926 г. пры факультэце гаспадаркі і права БДУ пачаў працаваць Беларускі кабінет па вывучэнні злачынца і злачыннасці. Яго дырэктарам быў прызначаны прафесар А. К. Ленц, які адначасова з'яўляўся загадчыкам кафедры псіхіатрыі медыцынскага факультэта БДУ [7]. Ён стаў заснавальнікам фізіялагічнага кірунка ў беларускай псіхіятрыі і на многія гады наперад вызначыў развіццё навуковай думкі ў гэтай галіне навукі ў рэспубліцы. Слынным даследчыкам уведзена ў клінічную практыку паняцце «сацыяпатыя», якое знайшло адлюстраванне ў сучасных міжнародных класіфікацыях псіхічных і паводніцкіх расстройстваў. У адзначаным кабінеце А. К. Ленц узначаліў секцыю крымінальнай псіхалогіі і псіхіятрыі. Яго даследаванні прымыкалі да антрапалагічнай школы крымінальнага права.

Другую секцыю Беларускага кабінета па вывучэнні злачынца і злачыннасці – секцыю крымінальнай сацыялогіі – узначальваў прафесар В. М. Шыраеў [8, с. 75].

Яшчэ раней, у 1921 г., было ўтворана першае судова-медыцынскае аддзяленне ў Беларусі пры Цэнтральнай хіміка-бактэрыялагічнай станцыі Наркамата аховы здароўя БССР [9].

На акадэмічнай аснове пытанне даследавання злачыннасці было ўскладзена Прэзідыумам ЦВК БССР на кафедру савецкага права БАН. Ён жа праявіў ініцыятыву аб утварэнні Інстытута судовай навукова-даследчай экспертызы. Яго адсутнасць вельмі дрэнна адбівалася на працы следчых, пракурорскіх і судовых органаў. Таму пастановай СНК БССР ад 16 жніўня 1929 г. пры НКЮ БССР быў утвораны Інстытут судовай навукова-даследчай экспертызы, асноўнай функцыі якога з'яўлялася забеспячэнне дзейнасці ўсіх судова-следчых органаў Беларусі. Першым дырэктарам інстытута стаў буйны вучоны, судовы медык і крыміналіст, доктар медыцынскіх навук, прафесар Васіль Фёдаравіч Чэрвакоў (1894–1976) [10, с. 42].

В. Ф. Чэрвакоў з'яўляецца і аўтарам першай айчыннай манаграфіі «Судебная баллистика» (1937), трох іншых манаграфій і больш за 100 навуковых прац. За час навуковай дзейнасці падрыхтаваў 5 дактароў і 30 кандыдатаў медыцынскіх навук. У 1938 г. ён пераехаў на працу ў Маскву.

Першапачаткова Палажэннем аб Інстытуце судовай навукова-даследчай экспертызы на яго было ўскладзена шмат задач, у тым ліку і правядзенне паўторных экспертыз, што супярэчыла Палажэнню аб судова-меды-

цынскай экспертызе і замаруджвала намаганні па распрацоўцы пытанняў крыміналістычнай экспертызы.

З утварэннем у верасні 1931 г. Цэнтральнай судова-медыцынскай лабараторыі Народнага камісарыята аховы здароўя БССР стала магчымым вызваліць Інстытут ад нехарактэрных для яго функцый па даследаванню судова-медыцынскіх аб'ектаў [11, с. 4].

3 лютага 1932 г. пастановай СНК БССР Інстытут навукова-судовай экспертызы быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны інстытут крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы пры НКЮ БССР. Перад ім была пастаўлена задача па арганізацыі крыміналагічных даследаванняў. Утвараецца аддзел крыміналогіі.У адпаведнасці з пастановай Саўнаркома БССР калегія Наркамата юстыцыі рэспублікі 28 сакавіка 1932 г. зацвердзіла Палажэнне пра БДІККСЭ.

Інстытут адкрыў свой навукова-паказальны музей, у якім прадстаўлены матэрыялы пра гісторыю развіцця крыміналістыкі і судовай экспертызы ў БССР, прымяненні навуковых метадаў расследавання злачынстваў органамі пракуратуры, следства, суда, дзяржаўнай бяспекі, юстыцыі [10, с. 43].

У фондзе Наркамаце працы БССР Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь маюца звесткі пра стаўкі па гэтаму інстытуту на 1930–1932 гг., якія дазваляюць не толькі ўстанавіць колькасны склад установы, але і яго структуру. На 1930 г. НДІ складаўся з дырэктара і трох секцый: фізіка-хімічных даследаванняў, індетыфікацыі і судовага фатаграфічнага аналізу, біялагічнага і судова-медычнага аналізу. Мелася ўсяго 8 ставак [12, арк. 268].

На 15 лютага 1931 г., па сведчанні наркома юстыцыі і пракурора БССР М. А. Ляўкова, інстытут меў ужо 18 ставак. Замест секцый былі ўтвораны наступныя аддзяленні: фізіка-хімічнае, якое складалася з загадчыка, старшага судовага хіміка, старшага асістэнта і лабаранта; біялагічнае – загадчык, асістэнт, эксперт-псіхіятр; судова-фатаграфічнае – загадчык, тэхнік-фатограф; юрыдычнай індэтыфікацыі – загадчык, асістэнт, эксперт-індэтыфікатар; навучальна-паказальны музей – загадчык; аддзел бухгалтарскай экспертызы – галоўны бухгалтар; тэхнічны персанал – машыністка-справавод, загадчык гаспадаркай, санітар, прыбіральшчыца [12, арк. 261–262].

Амаль праз год, 5 лютага 1932 г., у дакуменце Народнага камісарыята працы БССР гэта ўстанова ўжо стала называцца Беларускі дзяржаўны інстытут крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы. У ім працавала 14 супрацоўнікаў, не лічачы тэхнічны персанал [13, арк. 164].

Пра гэта сведчыць і Палажэнне менавіта пра Беларускі дзяржаўны інстытут крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы [14].

Паступова адбывалася накапленне навуковай экспертнай асновы, сістэматызаваўся эмпірычны матэрыял. Па сведчанні кандыдата юрыдыч-

ных навук Е. П. Арэхавай, у 1932 г. былі выдадзены «Труды Белорусского научно-исследовательского института криминалистики и судебной экспертизы» ў двух тамах, у 1936 г. – «Систематический библиографический указатель по судебной экспертизе и научным областям». У 1935 г. В. Ф. Чэрвакоў абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «О «патологии» винтовки в судебно-медицинском и криминалистическом отношении». Аднак асноўная ўвага інстытутам надавалася альбо распрацоўцы прыкладных палажэнняў крыміналістычнай экспертызы, альбо працэсуальных пытанняў яе прызначэння і вытворчасці (С. В. Барадзін, А. і. Вінберг, А. В. Дулаў, Б. Л. Зотаў і інш. [15, с. 85].

Гэта пацвярджаюць і працы НДІ крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы НКЮ, якія маюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці, за 1932 г., вып. 1, 2. Адначасова яго супрацоўнікі друкавалі свае навуковыя работы і ў іншых выданнях. С. М. Гохман змясціў свой матэрыял «Да змагання за марксісцка-ленінскі крымінальны кодэкс» у «Працах Інстытута савецкага будаўніцтва і права» [16], С. Эднерал – у часопісе «Рэвалюцыйная законнасць» [17], а А. Н. Юрашкевіч – выдаў асобным выданнем працу «Работа і задачы сельскіх грамадзкіх судоў БССР» [18]. Друкаваліся працы і ў «Запісках Беларускай акадэміі навук» [19].

Аднак пытаннямі крыміналогіі інстытут займаўся непрацяглы час і таму быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны НДІ крыміналістыкі і судовай экспертызы пры НКЮ БССР. Крыміналагічныя даследаванні былі спынены.

З пастановы СНК БССР ад 27 кастрычніка 1934 г. «Аб парадку падрыхтоўкі аспірантаў і кантынгентах прыёму на 1934/1935 навучальны год» за № 1762 бачна, што існаваў Інстытут крыміналістыкі і судовай экспертызы. Паколькі для яго быў устаноўлены план прыёма ў аспірантуру 2 чалавек, то можна заключыць, што ў ім працавалі высокакваліфікаваныя навуковыя кадры [20].

Установа актыўна займалася навукова-даследчай працай. На 1934 г. былі вызначаны дзве асноўныя праблемы. Адна з іх – вывучэнне змянення формаў, характару і руху класава небяспечнай дзейнасці ў БССР. У адпаведнасці з ёй распрацоўваліся такія тэмы, як хуліганства ў горадзе, хуліганства на вёсцы, узброенныя грабяжы (па матэрыялах Вярхоўнага суда БССР). Тэмы выконвалі Апрэлаў, Андрэйчык, Эдэнтух, Тамаркін, Мінкін. Іх выкананне планіравалася на студзень – чэрвень 1934 г.

Другая праблема – вывучэнне новых метадаў крымінальнай тэхнікі і навукова-судовай экспертызы. Для яе даследавання было вырашана распрацаваць наступныя тэмы: расследаванне спраў аб раскраданні ў складах, магазінах, кааператыўных і дзяржаўных установах; біялагічнае вызначэнне груп у крывяных клетках; атручэнне стравамі, іх крыніцы, характарыстыка і спосабы папярэджання. Выканаўцамі гэтых тэмаў з'яўляліся Мурашка, Левін, Нафталін, Бенеман, Кварын, Эстрына, Канановіч, Чарлёнак. Працы павінны былі быць падрыхтаваны на працягу студзеня – кастрычніка 1934 г. [21, арк. 109].

25 кастрычніка 1936 г. за № 27 СНК БССР прыняў пастанову «Аб перадачы Навукова-даследчага інстытута крыміналістыкі і судовай экспертызы пад ведама Пракуратуры Рэспублікі». З яе бачна, што Наркамат юстыцыі БССР і Пракуратура рэспублікі дамовіліся аб перадачы з-пад ведама НКЮ ў падпарадкаванне Пракуратуры НДІ крыміналістыкі і судовай экспертызы [22, арк. 325 аб.]. Аднак з гэтага часу матэрыялаў пра Інстытут у Нацыянальным архіве выявіць не ўдалося.

Маецца пастанова СНК СССР ад 15 чэрвеня 1938 г. аб тым, што Лабараторыя па навукова-даследчай працы Пракуратуры СССР з 1 ліпеня 1938 г. перадавалася ў вядзенне Акадэміі навук СССР і была ўключана ў склад Інстытута права АН СССР пад назвай «Крыміналістычная лабараторыя».

У сувязі з гэтым Пракурор СССР А. Я. Вышынскі 16 ліпеня 1938 г. накіраваў ліст за № 25/26 пракурорам саюзных і аўтаномных рэспублік, краёў, абласцей і аўтаномных абласцей і пракурорам гг. Масквы і Ленінграда, ў якім паведамляў, што «во избежание задержки в производстве следствия и излишней переписки при назначении графической экспертизы не обращаться в Лабораторию Института права АН СССР, а пользоваться местными экспертами или помощью юридических институтов» [23, арк. 106, 113].

З гэтага можна заключыць, што і пры Беларускім дзяржаўным юрыдычным інстытуце існавала лабараторыя, у якой можна было праводзіць пэўную экспертызу.

Такім чынам, выкладзены матэрыял дазваляе заключыць, што патрэбнасці практыкі праваахоўных органаў Беларусі ў міжваенны перыяд патрабавалі ўтварэння спецыялізаванай дзяржаўнай навукова-даследчай установы, якая б займалася пытаннямі крыміналістыкі і судовай экспертызы. Такая ўстанова ў якасці інстытута стала афіцыйна існаваць з 1929 г., хоць пытанне аб яе адкрыцці ставілася яшчэ з сярэдзіны 1920-х гг. З-за пазіцыі вучоных і практыкаў, магчымасцей рэспублікі адбывалася пэўная трансфармацыя яе назвы, што адбівалася на накірунках яе дзейнасці. З цягам часу склаўся творчы навуковы калектыў, які заклаў аснову для развіцця крыміналістыкі, крыміналогіі і судовай экспертызы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Статут Вялікага Княства Літоўскага. – Мінск: Беларусь, 2002. – 207 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1145.
3. НАРБ. – Спр. 416.
4. Очерки истории милиции Белорусской ССР, 1917–1987. – Минск: Беларусь, 1987. – 535 с.
5. Очерки по истории юридических научных учреждений в СССР. – М.: Наука, 1976. – 238 с.

6. *Гаўзе, Ф.* Аб арганізацыі навукова-судовай экспертызы ў БССР / Ф. Гаўзе // Рэвалюцыйная законнасць. – 1928. – № 1–2. – С. 7–12.

7. *Ленц, А. К.* Беларускі кабінет па вывучэнню злачынцы і злачыннасці, яго мэты і характар дзейнасці / А. К. Ленц // Известия НКЮ БССР. – 1927. – № 1.

8. *Барков, А. В.* Становление школы уголовного права в Белорусском государственном университете / А. В. Барков // Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць на ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце: зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І. А. Юхо / рэдкал.: С. А. Балашэнка (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск: Бизнесофсет, 2012. – С. 75–82.

9. Об образовании Государственного комитете судебных экспертиз Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sudexpert.gov.by/ru/history.html. – Дата доступа: 05.09.2018.

10. Министерство юстиции Республики Беларусь, 1919–2005 / под общ. ред. В. Г. Голованова. – Минск: Тонпик, 2005. – 184 с.

11. Становление и развитие научно-исследовательского института проблем криминологии, криминалистики и судебной экспертизы Министерства юстиции Республики Беларусь // Юстиция Беларуси. – 2006. – № 8.

12. НАРБ. – Ф. 44. – Воп. 1. – Спр. 1322.

13. НАРБ. – Спр. 2004.

14. Палажэнне аб Беларускім дзяржаўным інстытуце крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы // Беларускі дзяржаўны інстытут крыміналогіі, крыміналістыкі і судовай экспертызы НКЮ. – 1932. – Вып. 1. – С. 54–58.

15. *Орехова, Е. П.* Становление и развитие судебной экспертизы / Е. П. Орехова // Судебная экспертиза. Научные публикации. – 2017. – № 2(42). – С. 83–89.

16. *Гохман, С. М.* Да змагання за марксісцка-ленінскі крымінальны кодэкс / С. М. Гохман // Працы Інстытута савецкага будаўніцтва і права / БАН. – 1931. – [ненумарны зб.]. – С. 147–164.

17. *Эднерал, С.* Аб спрашчэнні работы судова-следчага апарату / С. Эднерал // Рэвалюцыйная законнасць. – 1928. – № ¾. – С. 18 – 24.

18. *Юрашкевіч, А. Н.* Работа і задачы сельскіх грамадзкіх судоў БССР. – Мінск: БелАН, 1933. – 44 с.

19. *Гохман, С. М.* Пытанні судовай дзейнасці і навукова-даследчай работы ў вобласці права / С. М. Гохман // Запіскі БелАН. – 1934. – № 3. – С. 133–151.

20. ЗЗ БССР. – 1934. – № 45. – Арт. 222.

21. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 572.

22. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 1.  Спр. 881 а.

23. НАРБ. – Ф. 750. Воп. 1. Спр. 691.

**(Дата падачы: 05.02.2020 г.)**